Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

ВОЛЬНАЯ ПРАЦА

Орган Беластоцкага абкома і гаркома КП(б)Б і аблвыканкома.

Год выдання другі.

№ 68 (137)
СУБОТА
23
САКАВІКА
1940 г.

Цана 10 капеек

ЗАЎТРА З ШАСЦІ ГАДЗІН РАНІЦЫ ПАЧЫНАЮЦЦА ВЫБАРЫ ДЭПУТАТАЎ У ВЯРХОЎНЫЯ СОВЕТЫ СССР І БССР.

Усе да выбарчых урнаў! Галасуйце за кандыдатаў Сталінскага блока комуністаў і беспартыйных!



НІКАЛАЙ ІВАНАВІЧ ПРОХАРАЎ,
кандыдат у дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР па выбарчай акрузе № 355



АЛЯКСЕЙ ГАЎРЫЛАВІЧ РУМЯНЦАЎ,
кандыдат у дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР па выбарчай акрузе № 333



КАНСТАНЦІН ГРЫГОР'ЕВІЧ АЛЯКСЕЕЎ,
кандыдат у дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР па выбарчай акрузе № 377

25-тысячны перадвыбарчы мітынг працоўных города Беластока

Хмуры ветраны дзень. Але радас... твары, светла і лёгка на сэрцы. ...ацца спяваць нешта вясёлае, ...нае і хвалюючае...

Упрыгожаны Беласток красуе ...яточным убраннем.

Пяць гадзін вечара. На плошчу Советаў з усіх канцоў горада накіроўваюцца калоны дэманстрантаў. Здалёк даносяцца гукі аркестраў і радасных совецкіх песень...

Плошча паступова запаўняецца народам. Вось прыходзіць калона рабочых і работніц, інжынерна-тэхнічных работнікаў 29-й тэкстыльнай фабрыкі. Сярод партрэтаў правадыроў, сцягоў і лозунгаў—словы: «29-я фабрыка выканала квартальны план 13 сакавіка. Дадзім краіне да 1 красавіка 26 тысяч метраў сукна звыш плана».

Плошча не можа ўмясціць усіх дэманстрантаў. 25 тысяч працоўных Беластока сабраліся на перадвыбарчы мітынг. Яны дэманструюць радасць і шчасце вызваленага народа, маральна-палітычнае адзінства і згуртаванасць, сваю любоў і адданасць комуністычнай партыі і правадыру народаў вялікаму Сталіну.

Грыміць вясёлая музыка. Тысячы галасоў высока ўзнімаюць песню аб Сталіне:

Ад краю да краю, па горных
вяршынях,
Дзе вольны арол развівае
палёт,
Аб Сталіне мудрым, любімым
і родным
Цудоўную песню складае народ.

Нізка над плошчаю пралятае самалёт. Ён скідае безліч лістовак. Белымі птахамі ў паветры доўга кружацца і плаўна апускаюцца яны на плошчу.

На трыбуне — кандыдаты ў дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР, партыйныя работнікі, камандзіры Чырвонай Арміі. Мітынг адкрыў кандыдат у дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР, сакратар Беластоцкага гаркома КП(б)Б тав. Тупіцын. У сваёй прамове ён гаварыў аб вызваленні працоўных Заходняй Беларусі ад нацыянальнага і эканамічнага прыгнёту, палітычнага бяспраўя, якое цярпеў народ пры панаванні памешчыкаў і фабрыкантаў.

— Зараз народы заходніх абласцей Беларусі, — гаворыць тав Тупіцын, — у дружнай сям'і народаў СССР карыстаюцца вялікімі правамі Сталінскай Канстытуцыі, выбіраюць сваіх прадстаўнікоў у вярхоўныя органы ўлады.

На выбарах партыя большэвікоў выступае ў блоку, у саюзе з беспартыйнымі рабочымі, сялянамі, інтэлігенцыяй. Гэты блок атрымае бліскучую перамогу.

Прамова тав. Тупіцына выклікае дружныя апладысменты многатысячнага мітынга і буру прывітальных воклічаў у чэсць комуністычнай партыі і таварыша Сталіна.

Слова атрымлівае кандыдат у дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР тав. Іваноў.

ПРАМОВА ТАВАРЫША ІВАНОВА

Таварышы! Дазвольце перадаць усім выбаршчыкам удзячнасць за вялікае давер'е, аказанае мне — простаму рабочаму. Толькі у Совецкім Саюзе, толькі ў краіне соцыялізма, рабочыя ад станка вылучаюцца на дзяржаўную работу, выбіраюцца ў вярхоўныя органы ўлады. Я запэўніваю вас, што аддам усе свае сілы, каб апраўдаць вялікае давер'е народа, аказнае мне. Клопаты аб працоўных, аб іх паўсядзённым жыцці будуць заўсёды ў маіх думках. Быць слугою народа, выконваць яго волю — гэта адказная і пачотная справа **(Апладысменты).**

Затым выступае кандыдат у дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР тав. Пятроўская.

ПРАМОВА ТАВАРЫША ПЯТРОЎСКАЙ

— Таварышы! Вызваленыя жанчыны заходніх абласцей БССР перажываюць зараз самыя радасныя дні. Упершыню мы будзем галасаваць за нашых народных прадстаўнікоў у вярхоўныя органы ўлады. Якая вялікая радасць для нашых жанчын, якія маюць права выбіраць і быць выбранымі ў наш соцыялістычны парламент.

Зусім недаўна забітая, бяспраўная жанчына панскай Польшчы не магла і марыць аб гэтым. Не маглі марыць жанчыны нават аб кваліфікаванай рабоце. У панскай Польшчы дзесяткі тысяч жанчын выкідваліся на вуліцу, жылі ў голадзе і галечы.

Магутная Чырвоная Армія вызваліла нас ад гэтага пакутнага жыцця. Зараз жанчыны атрымалі сапраўднае права на жыццё. Яны вылучаюцца на кіруючую гаспадарчую і палітычную работу. Дзіцячыя яслі і сады стварылі жанчынам умовы спакойнай працы. Гэта ўсё дала нам совецкая ўлада.

Жанчыны заходніх абласцей Беларусі за ўсё гэта дзякуюць вялікаму совецкаму народу, партыі большэвікоў і нашаму любімаму Сталіну.

Прыношу вялікую ўдзячнасць выбаршчыкам за вялікае давер'е, аказанае мне, за вылучэнне кандыдатам у дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР.

Няхай жыве бацькаўшчына усіх працоўных — СССР!

Няхай жыве вялікі Сталін! **(Апладысменты).**

Затым слова прадастаўляецца кандыдату ў дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР тав. Машэвіцкаму.

ПРАМОВА ТАВАРЫША МАШЭВІЦКАГА

— Таварышы! Прыгнечаныя народы Заходняй Беларусі, жывучы пад ярмом памешчыкаў і капіталістаў, заўсёды звярталі свае погляды на ўсход, на краіну соцыялізма. З нецярплівасцю чакалі яны, калі і над зямлёй Заходняй Беларусі засвеціць сонца Сталінскай Канстытуцыі. Гэты дзень настал.

У блоку з комуністамі ідуць свабодныя працоўныя на выбары дэпутатаў Вярхоўных Советаў. У гэтым блоку, у цесным саюзе яны даб'юцца новых перамог не толькі ў выбарах дэпутатаў, але і ў соцыялістычным будаўніцтве на тэрыторыі заходніх абласцей Беларусі **(Апладысменты).**

За ім слова атрымлівае кандыдат у дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР тав. Вайцэшук.

ПРАМОВА ТАВАРЫША ВАЙЦЭШУКА

— Таварышы! 24 сакавіка народы заходніх абласцей Беларусі будуць выбіраць сваіх дэпутатаў у Вярхоўныя Советы СССР і БССР. Гэтыя правы дала нам самая дэмакратычная ў свеце Сталінская Канстытуцыя.

Выбаршчыкі Чыгуначнай Акругі аказалі мне вялікае давер'е, вылучыўшы кандыдатам у дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР. Дазвольце першае слова ўдзячнасці, любві і адданасці выказаць таму, пад чыім кіраўніцтвам моцна і нерушыма дружба народаў усіх нацыянальнасцей, таму, хто вядзе нас да шчаслівага жыцця — вялікаму Сталіну.

Дазвольце прынесці вам глыбокую ўдзячнасць за аказанае давер'е і запэўніць вас, што я да апошняй кроплі крыві аддам жыццё за шчасце совецкага народа, за справу партыі Леніна—Сталіна.. **(Апладысменты).**

На мітынгу прынята прывітальнае пісьмо правадыру народаў вялікаму Сталіну. Над плошчай узнімаецца лес рук пры галасаванні. Зноў грымяць апладысменты, нясуцца прывітальныя воклічы. Гучыць музыка.

Мітынг скончан. З усіх бакоў на розных мовах гучаць прывітанні:

— Няхай жыве непераможная Чырвоная Армія — наша вызваліцельніца!

— Няхай жыве сталінскі блок комуністаў і беспартыйных!

— Няхай жыве комуністычная партыя і геніяльны правадыр працоўных наш любімы Сталін!

— «Ура» таварышу Сталіну!

Магутнае «ура» пракатваецца па плошчы. Аркестры іграюць «Інтэрнацыянал». 25 тысяч галасоў падхапляюць велічную мелодыю пролетарскага гімна...

І. Каралькоў.
Т. Ляовіч.

МАСКВА, КРЭМЛЬ

ПРАВАДЫРУ НАРОДАЎ ТАВАРЫШУ СТАЛІНУ

Дарагі Іосіф Вісарыёнавіч! Мы, рабочыя, работніцы і працоўныя горада Беластока, собраўшыся на агульнагарадскі мітынг, прысвечаны гістарычнаму дню, дню выбараў у Вярхоўныя Советы СССР і БССР, шлём Вам, правадыру працоўных усяго свету, наша палкае пролетарскае прывітанне.

Дарагі Іосіф Вісарыёнавіч!

Працоўныя заходніх абласцей Беларусі вечна будуць памятаць той гістарычны дзень, калі доблесная непераможная Чырвоная Армія, авеяная славай легендарных баёў і паходаў, прышла на дапамогу нам, народам заходніх абласцей Беларусі і вызваліла нас ад банкіраў, фабрыкантаў, заводчыкаў і памешчыкаў.

Гэту магутную Чырвоную Армію паслалі Вы, таварыш Сталін. З Вашым іменем на вуснах байцы Чырвонай Арміі дапамаглі нам, прыгнечаным народам, вызваліць ад панскай нечысці гарады і вёскі.

Цяпер мы, свабодныя грамадзяне вялікага Совецкага Саюза, сагрэтыя сонцам Сталінскай Канстытуцыі ў вялікай сям'і народаў СССР, ліквідуем рэшткі праклятага мінулага. Фабрыкі і заводы перасталі быць месцам эксплаатацыі і прыгнечання. Па-іншаму яны выглядаюць, па-іншаму мы ў іх працуем. Яны ператварыліся ў месца радаснай творчай працы, у крыніцу народнага дабрабыту.

Вялікая хартыя народаў — Канстытуцыя СССР, тварцом якой з'яўляецеся Вы,—дае народам нябачаныя правы: права на працу, права на адпачынак, права на асвету, права на матэрыяльнае забеспячэнне ў старасці, дае магчымасць кожнаму грамадзяніну актыўна ўдзельнічаць у дзяржаўным будаўніцтве, выявіць сябе ў любой галіне працы, раскрыцца для росквіту радаснага, шчаслівага жыцця ў адзінай шматнацыянальнай сям'і свабодных народаў.

Дарагі Іосіф Вісарыёнавіч!

Мы, працоўныя горада Беластока, упершыню за ўсю гісторыю адчулі радасць жыцця, убачылі свет, набылі радзіму-маці. Мы з гордасцю славім вялікую большэвіцкую партыю Леніна—Сталіна, пад кіраўніцтвам якой мы вызваліліся, пад кіраўніцтвам якой СССР стаў магутнай індустрыяльнай краінай.

Мы поўны гордасцю за нашае сёння і праменістае заўтра. Разам з усімі народамі СССР мы смела пойдзем да новых перамог комунізма і будзем мацаваць магутнасць вялікага Совецкага Саюза.

Пад яркім сонцам Сталінскай Канстытуцыі будзем змагацца за росквіт і славу нашай краіны, за шчаслівае, радаснае жыццё, за ўмацаванне абароназдольнасці і магутнасці нашай любімай радзімы.

Мы запэўніваем вас, таварыш Сталін, што ў гістарычны дзень, у дзень выбараў 24 сакавіка, мы ўсе, як адзін чалавек, з'явімся да выбарчых урнаў і прагаласуем за непераможны сталінскі блок камуністаў і беспартыйных. Гэтым самым яшчэ раз прадэманструем перад усім светам сваю арганізаванасць і згуртаванасць вакол партыі Леніна — Сталіна і совецкага ўрада, найглыбейшую любоў да соцыялістычнай радзімы, сваю няўхільную волю ісці наперад і наперад да ззяючых вяршынь чалавечага шчасця, таржаства комунізма ва ўсім свеце.

Няхай жыве непераможны сталінскі блок комуністаў і беспартыйных!

Няхай жыве вялікая партыя Леніна—Сталіна!

Няхай жыве лепшы друг чалавецтва, наш родны Сталін!

Я. ГАЛИЦКИЙ

ЗА СТАЛИНСКИХ ЛЮДЕЙ

В глазах пестрит
От радостных плакатов,
И слава их
Надеждою полны,
На дорогие лица кандидатов,
Избранников
Чудеснейшей страны!
Их имена
Уверенность в нас будят,
И слава их
Летит во все концы.
Ведь это наши
Трудовые люди,
Ведь это наши
Братья
И отцы!
Им наши чувства,
Помыслы известны,
Они носители
Передовых идей.
Мы верим им,
И голосуем честно
За этих честных
Сталинских
Людей!

г. Белосток.








КАНДЫДАТЫ У ДЭПУТАТЫ ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА БССР (злева направа): **Максімюк Еўдакія Фёдараўна** (выбарчая акруга № 349), **Банас-Банасюк Адольф Станіслававіч** (выбарчая акруга № 346), **Цанава Лаўрэнцій Фаміч** (выбарчая акруга № 353), **Гладкоў Пётр Андрэевіч** (выбарчая акруга № 332), **Касцюк Самуіл Сямёнавіч** (выбарчая акруга № 338), **Тупіцын Міхаіл Нікалаевіч** (выбарчая акруга № 350).

На выбарчых участках усё гатова для сустрэчы дарагіх гасцей

ЗАБЯСПЕЧЫМ ПЕРАМОГУ БЛОКА КОМУНІСТАЎ І БЕСПАРТЫЙНЫХ

(Гутарка з старшынёй Беластоцкай выбарчай акругі па выбарах у Совет Нацыянальнасцей Вярхоўнага Совета СССР сакратаром абкома КП(б)Б тав. Сямёнавым).

На ўчастках Беластоцкай выбарчай акругі па выбарах у Совет Нацыянальнасцей заканчваюцца апошнія прыгатаванні. Выбарчы актыў мабілізаван на канчатковае ўдакладненне спісаў выбаршчыкаў. Участковыя камісіі расстаўляюць сілы, размяркоўваюць абавязкі паміж сваімі членамі на дзень выбараў. Памяшканні ўчасткаў гатовы да сустрэчы дарагіх гасцей.

Усюды быў вывучан зварот ЦК КП(б)Б да выбаршчыкаў, узмоцнена агітацыя за кандыдатаў, з найвялікшым палітычным уздымам праходзяць сустрэчы кандыдатаў са сваімі выбаршчыкамі. Зварот ЦК КЦ(б)Б надрукаван на беларускай, рускай, польскай і яўрэйскай мовах больш чым у 300 тысяч экземпляраў і развезен на самалёце выбаршчыкам. У дзесятках тысяч экземпляраў распаўсюджаны біяграфіі кандыдатаў. Надрукавана 72 тысячы лозунгаў, 45 тысяч красачных плакатаў. Кожнаму выбаршчыку падрыхтавана прыгожа афармленае паведамленне на рускай, беларускай і польскай мовах.

Выбарчая кампанія выклікала небывалую палітычную і вытворчую актыўнасць мас. Сяляне вёсак Каліноўка, Саламянка і Каменка, Монькаўскага раёна, арганізавалі чырвоныя абозы з хлебам і мясам. За апошні час яны прадалі дзяржаве 519 тон хлеба і 598 цэнтнераў мяса. Чырвоныя абозы арганізуюцца паўсямесна.

Рыхтуючыся да вясны, сяляне абавязаліся абсеяніць усю зямлю добраякасным насеннем, дабіцца высокіх ураджаяў на вызваленай зямлі. Сотні перадавых сялян — былых батракоў, беднякоў і серадняков падалі заявы аб паступленні ў калгасы. Па вобласці арганізавана 28 калгасаў, арганізуецца 24 МТС і 164 зернаачышчальных пункты.

Нязмерна павысілася прадукцыйнасць працы. Машыніст Беластоцкага дэпо тав. Труфанаў правёў састаў з 62 вагонаў да ст. Граева па цвёрдаму графіку са скорасцю 31 кілометр у гадзіну. Паспяхова выконваюць абавязацельствы соцыялістычнага дагавора каваль паравознага дэпо Грыбнік і малатабоец Ленонцьеў, якія паказваюць узоры стаханаўскай работы. Работніца Бельскага кафельнага завода Стэльмачук, спаборнічаючы з рабочым Рыпгайлам, выконвае план на 180 процантаў. Соцыялістычным спаборніцтвам ахвачана 1770 рабочых і работніц тэкстыльнай прамысловасці, з іх 82 двухстаночнікі.

Вялікі размах прыняла агітацыйная работа ў Замбраўскім раёне. 34 агіткалектывы яднаюць 624 агітатараў, з іх 64 настаўнікі і 344 чалавекі з мясцовага актыва. У 468 гуртках вывучана Сталінская Канстытуцыя і выбарчы закон, зварот ЦК КП(б)Б, біяграфіі кандыдатаў. У раёне праведзена вялікая колькасць сходаў, якімі ахвачана звыш 20 тысяч выбаршчыкаў. Праведзены асобна сходы жанчын і моладзі. У Бельскім, Бранскім і іншых раёнах акругі таксама праведзена і праводзіцца вялікая работа.

Выбарчая кампанія ўскалыхнула самыя шырокія масы працоўных, падняла іх да палітычнага жыцця, вылучыла нямала таленавітых арганізатараў і агітатараў. Настаўніца Мангерштэрн умела кіруе гуртком у в. Андрыяны, Бельскага раёна. На канкрэтных прыкладах яна паказвае, што дала совецкая ўлада працоўным. У вёсцы Андрыяны за месяцы совецкай улады адкрыта новая школа, у якой навучаецца 130 дзяцей, працуе вячэрняя школа дарослых.

Агітатара часта дапаўняюць выбаршчыкі. Сялянка Дарашчук расказвае:

— Больш пяці год я працавала батрачкай у памешчыка і атрымлівала 95 грошаў. Совецкая ўлада дала мне зямлю, карову і інвентар. Зараз я наведваю вячэрнюю школу і ўжо магу чытаць газеты на беларускай і рускай мовах.

Выдатна працуе агітатарам, кіраўніком гуртка санурач Гросман у Граеве. Вялікую дапамогу аказваюць нам у агітацыйнай рабоце нашы шэфы. З гарадоў для дапамогі ў агітацыйнай рабоце на вёсцы мабілізавана 200 чалавек з партыйна-комсамольскага актыва.

Сустрэчы выбаршчыкаў са сваімі кандыдатамі праходзяць на высокім палітычным узроўні. У Кольна, напрыклад, для сустрэчы з кандыдатамі сяляне прыязджаюць за некалькі кіламетраў. У вёсцы Янава старык-селянін падышоў пасля схода да кандыдата і ўсхвалёваным голасам прасіў:

— Перадайце Сталіну вялікае наша дзякуй за вызваленне.

Усяго па акрузе з кандыдатамі сустрэліся 800 тысяч выбаршчыкаў. Кандыдат у дэпутаты Совета Нацыянальнасцей тав. Турлейскі пабываў ва ўсіх раённых цэнтрах, дзе сустракаўся з сваімі выбаршчыкамі. Сустрэчы былі сапраўднай дэманстрацыяй любві і адданасці вызваленага народа партыі большэвікоў, таварышу Сталіну.

Заўтра дружна пойдуць вызваленыя народы да выбарчых урнаў, каб прагаласаваць за лепшых сваіх сыноў і дачок, за радаснае і шчаслівае жыццё, за светлую будучыню, за комуністычную партыю, за геніяльнага правадыра і настаўніка, любімага Сталіна.

ПЕРАДВЫБАРЧАЯ ХРОНІКА

Моладзь Лапскага раёна актыўна ўдзельнічае ў кампаніі па выбарах у Вярхоўныя Советы СССР і БССР.

Маладыя агітатары тт. Сокал, Чорны і многія іншыя раней пры ўладзе памешчыкаў і капіталістаў былі пазбаўлены права выбіраць. Сёння яны не толькі маюць гэтае права, але і актыўна агітуюць за тое, каб кожны выбаршчык прыняў удзел у выбарах, агітуюць за кандыдатаў сталінскага блока комуністаў і беспартыйных.

С. Заяц.

У вёсцы Дуброўска, Беластоцкага раёна, адбыўся агульны сход сялян, прысвечаны падрыхтоўцы да выбараў у Вярхоўныя Советы СССР і БССР.

Выступаючы, на сходзе, сяляне ў сваіх прамовах звярнуліся да ўсіх выбаршчыкаў з заклікам аддаць свае галасы за кандыдатаў блока комуністаў і беспартыйных — за тт. Кавалёва, Турлейскага і Ігнатовіча. Сяляне прынялі пастанову, у якой абавязаліся датэрмінова закончыць выкананне плана лесазагатовак.

Шпаноўскі.

ГАРАЧЫЯ ДНІ

(Гутарка з старшынёй участковай выбарчай камісіі № 65 Цэнтральнай выбарчай акругі Н. І. Гальперыным).

— З поўным усведамленнем ўсёй адказнасці задач праводзілі члены нашай камісіі падрыхтоўку да выбараў дэпутатаў у Вярхоўныя Советы СССР і БССР. Пасля азнаямлення з тэрыторыяй участка, мы перш за ўсё удакладнілі спісы выбаршчыкаў. Гэта была нялёгкая работа. Нам далі спіс, у якім налічвалася ўсяго 908 выбаршчыкаў. Мы выявілі многа прапушчаных і зараз у нашым спісе 1400 чалавек. Зараз спісы выбаршчыкаў канчаткова ўдакладнены і начыста надрукаваны.

Памяшканне ўчастка мы любоўна ўпрыгожылі як знадворку, так і знутры. Мы стварылі ўсе ўмовы для выбаршчыкаў, якія заходзяць на ўчастак.

Выбарчая кампанія вырасціла нямала таленавітых арганізатараў, страсных агітатараў з радавых рабочых, хатніх гаспадынь і служачых. З агітатараў асабліва вылучаюцца добрай работай тав. Камельман, былая палітзняволеная, зараз работніца фабрыкі № 29, тт. Валкавыскі. Ліпман, Гольдзінштэйн, Фехнер, а таксама агітатары тт. Апрэлікаў, Голад і Патапаў.

Аднойчы на ўчастак зайшла хатняя гаспадыня Цікоцінская. Яна сказала:

— Даручыце мне якую-небудзь работу па выбарах. Я хачу прыняць удзел у гэтай вялікай радаснай рабоце.

Тав. Цікоцінская арганізавала на сваёй вуліцы фота-вітрыну, праверыла правільнасць спісаў выбаршчыкаў, дапамагае агітатарам.

Хатняя гаспадыня Вайнштэйн, якая пражывае па Кастрычніцкай вуліцы, таксама ва ўсім дапамагае выбарчай камісіі.

Выбарчая кампанія выклікала небывалы палітычны і вытворчы ўздым. Сустрэчы з кандыдатамі праходзяць на высокім палітычным узроўні. Усе выбаршчыкі заяўляюць, што аддадуць сбае галасы за кандыдатаў сталінскага блока комуністаў і беспартыйных.

Рабочыя 29 фабрыкі яшчэ ў пачатку выбарчай кампаніі ўзялі на сябе абавязацельства выканаць квартальны план да дня выбараў. На 15 сакавіка квартальны план па пражы быў выканан на 104,4 процанта, па ткацкаму цэху —на 101.6 проц. Да дня выбараў рабочыя абавязаліся даць 15.000 метраў тканіны звыш плана, а да канца квартала — 26.000 метраў.

Соцспаборніцтвам ахоплена 183 чалавекі. Восем двустаночнікаў сістэматычна перавыконваюць нормы. Лепшыя з іх тт. Баярскі, Юдэлевіч, Козак.

Зараз для камісіі наступілі гарачыя дні. Заканчваюцца апошнія прыгатаванні. Гатовы кабіны, урна, памяшканне ўпрыгожана. Паміж членамі камісіі размеркаваны абавязкі на 24 сакавіка. Вылучаны таварышы для выдачы бюлетэняў, дзяжурныя ў пакоі кабін, дзяжурныя ля урны і т. д. Мы не забылі аб хворых і прастарэлых выбаршчыках. Такіх у нас выяўлена больш 10 чалавек. Да іх член камісіі паедзе на дом. Мы выявілі выбаршчыц з малымі дзецьмі. Да іх мы таксама пашлём агітатараў, якія пабудуць з дзецьмі ў час галасавання. Мы стараемся не ўпусціць ніводную дробязь, каб дзень выбараў правесці чотка і арганізавана.

24 сакавіка ў нас будзе абсталяван пакой адпачынку, у якім будзе даміно і шашкі, баян, патэфон. У клубе будзе дэманстравацца кіно.

Няма сумнення, што выбары 24 сакавіка забяспечаць яшчэ раз бліскучую перамогу сталінскага блока комуністаў і беспартыйных.



Члены выбарчай камісіі ўчастка № 52 г. Беластока за ўдакладненнем выбарчых спіскаў. Злева направа: Л. Я. Дзіновіч, З. Ю. Клійф, З. В. Брэзіна і І. С. Камінскі. (Фотахроніка Белта).

ПАЛІТЫЧНАЯ ШКОЛА ПРАЦОЎНЫХ

(Гутарка з старшынёй Чыгуначнай выбарчай акругі тав. Гарбуновай).

Новыя грамадзяне, якія ўліліся ў дружную сям'ю краіны соцыялізма, карыстаюцца ўсімі правамі, усімі дабротамі Сталінскай Канстытуцыі. Яны атрымалі магчымасць жыць так, як жывуць усе грамадзяне нашай цудоўнай радзімы. Вось чаму на ўсіх перадвыбарчых сходах з гарачай любоўю і аднадушшам чыгуначнікі вылучылі першым кандыдатам у соцыялістычны парламент правадыра ўсіх працоўных таварыша Сталіна.

Зусім мала часу прайшло з таго моманту, як Чырвоная Армія вызваліла народы заходніх абласцей БССР ад гнёту польскіх паноў. Але зроблена за гэты перыяд вельмі многа. Вось красамоўныя лічбы па адной толькі Беластоцкай чыгунцы. 8 тысяч новых рабочых, якія яшчэ нядаўна марнелі ад голаду і беспрацоўя, на сёнешні дзень атрымалі работу. З іх больш 100 чалавек вылучана на кіруючыя пасты. Арганізавана 22 медыцынскіх установы, 50 клубаў і чырвоных куткоў.

На ўсіх участках Чыгуначнай акругі прайшлі сустрэчы выбаршчыкаў са сваімі кандыдатамі ў дэпутаты Вярхоўных Советаў СССР і БССР. На сустрэчах кандыдаты расказалі свае біяграфіі, мабілізавалі чыгуначнікаў на дастойную сустрэчу дня выбараў.

Велізарную работу ў выбарчай кампаніі па мастацкаму абслугоўванню выбаршчыкаў праробіў клуб чыгуначнікаў. Калектыў мастацкай самадзейнасці: духавы аркестр, харавы гурток, дэкламатары — давалі свае выступленні на ўчастках.

Выбарчая кампанія ўцягнула ў актыўнае палітычнае жыццё сотні новых людзей, якія раней былі пад спудам капіталізма. На прыклад, дамашнія гаспадыні 35 выбарчага ўчастка па сваёй ініцыятыве старанна і любоўна ўпрыгожылі памяшканне ўчастка.

Па ініцыятыве перадавых машыністаў, паказваючых узоры працы, у дэпо, арганізавана калона паравозаў ім. Л. М. Кагановіча. Машыністы наркомаўскай калоны тт. Герасімовіч, Мядзведзеў, браты Рашкоўскія ўзялі на сябе абавязацельствы вадзіць паязды па графіку, эканоміць паліва. Яны шэфствуюць над адстаючымі паравозамі.

Актыўны ўдзел у выбарчай кампаніі з'явіўся лепшай школай палітычнага росту працоўных. Неабходна і надалей захаваць гэтую школу, не парываць сувязі з выбаршчыкамі. Гэту ідэю вітаюць самі выбаршчыкі. Тры дні назад да даверанай асобы тав. Анціпінай прыходзілі выбаршчыкі з 32 участка і прасілі, каб і пасля 24 сакавіка да іх прыходзілі агітатары.

Заўтра вялікае свята народаў заходніх абласцей БССР. Яны пашлюць лепшых сваіх сыноў у вышэйшыя органы дзяржаўнай улады. Я ўпэўнена, што чыгуначнікі з радасцю аддадуць свае галасы за кандыдатаў сталінскага блока комуністаў і беспартыйных.

Участак гатоў да сустрэчы выбаршчыкаў

(Гутарка з намеснікам старшыні выбарчай камісіі № 78 тав. Вінакурам).

Наш участак невялікі, налічвае ўсяго 675 выбаршчыкаў, з якіх у гуртках па вывучэнню Сталінскай Канстытуцыі займалася больш 300 чалавек. Астатнія былі ахоплены індывідуальнымі гутаркамі і агульнымі сходамі. Нашы агітатары — 17 чалавек — спачатку чыталі і растлумачвалі Сталінскую Канстытуцыю і Палажэнне аб выбарах, потым пераключыліся на агітацыю за нашых кандыдатаў, звязваючы гэта з растлумачэннем тэхнікі галасавання. Аднача сова яны растлумачвалі ўсе пытанні бягучага палітычнага жыцця нашай краіны і адказвалі на ўсе жыццёвыя пытанні, узнікаючыя ў нашых выбаршчыкаў. Неаднаразова агітатары і члены ўчастковай камісіі аказвалі дапамогу насельніцтву ў розных бытавых патрэбах. Напрыклад, ва ўчастковую камісію звярнуўся выбаршчык А. Е. Беластоцкі з просьбай аб аказанні яму медыцынскай дапамогі. Просьба яго была неадкладна задаволена. Работніца Я. В. Камінская два месяцы ляжала хворай і да яе ніхто не прыходзіў. Члены ўчастковай камісіі дапамаглі ёй.

Па меры набліжэння дня выбараў мы яшчэ больш узмацнілі агітацыйную работу. Спачатку нашы агітатары займаліся адзін раз у тры дні ў гуртках, затым — праз дзень хадзілі па кватэрах, агітуючы за нашых кандыдатаў, а зараз агітатары і члены выбарчай камісіі штодзённа ходзяць па кватэрах, каб абсалютна да кожнага выбаршчыка давесці адозву ЦК КП(б)Б.

Акрамя індывідуальнай агітацыі ў нас адбыліся чатыры агульных сходы на якіх прысутнічалі ўсе выбаршчыкі.

Спіскі выбаршчыкаў канчаткова праверааны. Асобныя пропускі ўжо выпраўлены.

Наш участак гатоў да галасавання. Кабіны падрыхтаваны, бюлетэні на ўсіх кандыдатаў хаваюцца ў незгараемай шафе. Ёсць урна. Памяшканне забяспечвае нармальную работу ў дзень 24 сакавіка і добра ўпрыгожана лозунгамі і партрэтамі правадыроў. Участак радыёфікаван.

Выбаршчыкам уручаны запрашальныя білеты. Паміж членамі камісіі дакладна размяркованы абавязкі. Напярэдадні і ў дзень галасавання ўсе агітатары будуць на сваіх участках.

Настрой нашых выбаршчыкаў дае нам гарантыю, што мы атрымаем новую перамогу блока комуністаў і беспартыйных.

ВАЛКАВЫСК ПЕРАД ВЫБАРАМІ

Набліжэнне дня выбараў у нашым горадзе адчуваецца па незвычайнаму ажыўленню. Вуліцы горада упрыгожаны флагамі, выбарчымі лозунгамі, плакатамі. Праз галоўную вуліцу працягнута некалькі транспарантаў. На балконах, у вокнах многіх дамоў выстаўлены партрэты таварышоў Сталіна, Молатава, Варашылава. З лесу прывезены зялёныя ёлкі, якімі ўпрыгожаны фасады дамоў і ўваходы ў выбарчыя ўчасткі.

Калі ў горадзе быў атрыман зварот ЦК КП(б)Б, на выбарчых участках, прадпрыемствах горада і чыгуначным вузле прайшлі масавыя мітынгі выбаршчыкаў.

— Правільна гаворыцца ў звароце, — заяўлялі многія выступаючыя: — Хто імкнецца да таго, каб працоўныя нашай краіны былі надалей збаўлены ад якога-б там ні было беспрацоўя і няўпэўненасці ў заўтрашнім дні, хто хоча сапраўды паляпшэння матэрыяльна - бытавога становішча рабочых і служачых, той будзе галасаваць за партыю большэвікоў, той будзе галасаваць за кандыдатаў сталінскага блока комуністаў і беспартыйных.

— Так, мы хочам, каб мінулае ніколі не вярнулася, і мы будзем галасаваць за нашых кандыдатаў, за партыю, за Сталіна.

Незвычайная актыўнасць на выбарчых участках. Калі раней прыходзілі на заняткі гурткоў па 20—25 чалавек, зараз наведваюць іх па 60—70 чалавек.

Па гораду прайшлі масавыя сустрэчы кандыдатаў з выбаршчыкамі.

Кандыдат у дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР, токар чыгуначнага дэпо Сцяпан Крук правёў 15 сустрэч, на якіх прысутнічала 7.260 чалавек. На чатырох сустрэчах кандыдата ў дэпутаты Совета Нацыянальнасцей С. Прытыцкага са сваімі выбаршчыкамі прысутнічала 3.800 чалавек. На васьмі сустрэчах кандыдата ў дэпутаты Совета Саюза селяніна Сеўко прысутнічала 3.600 чалавек. Акрамя таго звыш 500 агітатараў расказваюць біяграфіі кандыдатаў у гуртках, на кватэрах выбаршчыкаў.

Мы зрабілі некалькі выбарачных праверак, як ведаюць выбаршчыкі сваіх кандыдатаў, і ўсюды сустракалі адказ — ведаюць.

На вуліцы Новая Воля мы гутарылі з 70-гадовай бабуляй. На наша пытанне, ці ведае яна, за каго будзе галасаваць, яна не толькі заявіла, што ведае, але і расказала нам кароткія біяграфіі ўсіх трох кандыдатаў.

За гэтыя дні на ўчастках вырасла нямала актыва з радавых выбаршчыкаў, якіх мы скарыстоўваем як агітатараў для асобных даручэнняў. Да ліку такіх трэба аднесці работніцу Рубіну, рабочага лесазавода Ходана, рабочага мясакамбіната Касяровіч, хатнюю гаспадыню Козел і іншых. Яны разам з выбаршчыкамі мяркуюць, каб пасля выбараў захаваць на выбарчых участках агітпункты, не спыняць масавую палітычна-выхаваўчую работу з насельніцтвам. Ужо зараз вакол выбарчых участкаў на прадпрыемствах і ўстановах створаны арганізацыі МОПР, Асоавіяхіма, вячэрнія школы дарослых. Гурткамі па ліквідацыі непісьменнасці ахоплена звыш 400 выбаршчыкаў.

Зараз на ўсіх 10 выбарчых участках заканчваюцца апошнія прыгатаванні. Днямі адбылася гарадская нарада членаў участковых выбарчых камісій. Нарада абмеркавала пісьмо тав. М. І. Калініна, у якім ён заклікае звярнуць увагу на размеркаванне абавязкаў сярод членаў участковых камісій, каб у першыя гадзіны не стварыць чаргі пры атрыманні бюлетэняў, указвае на парадак падліку галасоў.

Сёння ў горадзе будзе праведзен агульнагарадскі мітынг і масавыя сходы выбаршчыкаў на ўчастках з заклікам аддаць свае галасы за кандыдатаў сталінскага блока комуністаў і беспартыйных.

О. Карпей,
сакратар Валкавыскай акруговай выбарчай камісіі № 378.

Гор. Валкавыск, (па тэлефону).

Саколкаўскі раён напярэдадні выбараў

З велізарным натхненнем сустракаюць дзень выбараў працоўныя Саколкаўскага раёна. Горад Саколка прыведзен у святочны выгляд.


Не менш урачыста рыхтуецца да сустрэчы дня выбараў сельскае насельніцтва. У чэсць выбараў у многіх вёсках значна ўзрос продаж хлеба дзяржаве. Сяляне вёсак Адольфаўскага сельсовета ў чэсць выбараў рашылі пабудаваць шасейную дарогу Адольф—Саколка. На падвозцы камення штодзённа занята ад 40 да 130 сялянскіх падвод.

Агітатары ўсіх выбарчых участкаў знаёмяць выбаршчыкаў са зваротам ЦК КП(б) Б да ўсіх працоўных заходніх абласцей Беларусі. На занятках па вывучэнню гістарычнага звароту ЦК КП(б)Б, у памяшканні метэаралагічнай станцыі прысутнічала 70 чалавек, у райспажыўсаюзе—30 чалавек, на ўчастку № 94—60 і ў гуртку па Комуністычнай вуліцы — 20 чалавек.

Члены ўчастковых выбарчых камісій разам з агітатарамі робяць падворны абход усіх выбаршчыкаў, каб яшчэ раз праверыць дакладнасць спіскаў і азнаёміць кожнага выбаршчыка з тэхнікай галасавання. У Драглескім выбарчым участку пры абыходзе выяўлена 17 выбаршчыкаў, якія з прычыны хваробы не змогуць у дзень выбараў з'явіцца на выбарчы участак для галасавання. У Вольскім выбарчым участку ёсць рад выпадкаў выбыцця выбаршчыкаў, якія лічацца ў спісках данага населенага пункта.

Гарадскія выбарчыя ўчастковыя камісіі поўнасцю закончылі падрыхтоўку сваіх участкаў да выбараў. Зараз яны знаёмяць выбаршчыкаў з тэхнікай галасавання, рассылаюць запрашальныя паведамленні кожнаму выбаршчыку.

Федасенка.



АБРАМ ГЕШЭЛЕВІЧ МАШЭВІЦКІ
кандыдат у дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР па выбарчай акрузе № 354

ПОСПЕХ ГАЛАСАВАННЯ БУДЗЕ ЗАБЯСПЕЧАН

(Гутарка з старшынёй выбарчай камісіі 54 участка, 352 выбарчай акругі тав. К. К. Балтушковым).

— Наш участак ужо гатоў да сустрэчы дарагіх гасцей—выбаршчыкаў, якія будуць галасаваць за сваіх кандыдатаў у дэпутаты Вярхоўных Советаў. Сёння можна расказаць некаторыя вынікі работы ўчастковай камісіі і калектыва агітатараў, якія многа і паспяхова папрацавалі сярод насельніцтва. Камісія атрымала ад горвыканкома спісы выбаршчыкаў далёка няпоўныя і недакладныя. Мы паклалі многа працы на тое, каб усіх выбаршчыкаў нашага ўчастка дакладна запісаць. Зараз сакратар камісіі Соня Бабакова завяршае канчатковую апрацоўку спісаў.

Самым важным трэба лічыць агітацыйную работу. Пачынаючы з 6 лютага, на ўчастку былі арганізаваны і рэгулярна працавалі 26 гурткоў, у якіх нашы агітатары расказвалі выбаршчыкам, новым совецкім грамадзянам, праўду аб совецкім ладзе, аб Сталінскай Канстытуцыі, вывучалі Палажэнне аб выбарах. Прычым, растлумачваючы вялікія грамадскія праблемы, прыходзілася расказваць выбаршчыкам самыя элементарныя ісціны з совецкай рэчаіснасці, гаварыць аб вузка бытавых пытаннях. Але самае важнае дасягнута — нашы выбаршчыкі былі актывізаваны да грамадскага жыцця, захоплены цікавасцю да гістарычных перспектыў нашага шчаслівага соцыялістычнага грамадства.

Лепшыя нашы агітатары тт. Васільеў, Белаусаў, Фруауф, кіраўнікі брыгад агітатараў Хэйфец, Рашэгвікаў, Бальшакоў, давераны Крэпскі і многія іншыя працавалі асабліва старанна. Агітатар Фруауф, жыхар нашага ўчастка, на канкрэтных фактах свайго жыцця расказваў аб шчаслівай долі, якая выпала вызваленым працоўным. Ён пісаў таксама свае заметкі ў насценную газету пры ўчастку. Дарэчы, наша насценгазета «Голас выбаршчыка» была выпушчана тры разы і прыцягнула да супрацоўніцтва ў ёй вялікі актыў выбаршчыкаў і агітатараў.

Вынікам гэтай работы — добры, прыўзняты настрой выбаршчыкаў, якія гараць жаданнем аддаць свае галасы за народных кандыдатаў, аб каторых пераканаўча расказалі нашы агітатары. Па нашай акрузе ў Совет Саюза Вярхоўнага Совета СССР балатыруецца слаўны камандарм тав. Кавалёў, у Совет Нацыянальнасцей—тав. Турлейскі, у Вярхоўны Совет БССР—тав. Пятроўская. Нашы выбаршчыкі добра ведаюць гэтых дастойных прадстаўнікоў і заяўляюць, што з радасцю аддадуць за іх свае галасы.

Памяшканне нашага ўчастка поўнасцю гатова, каб прыняць заўтра выбаршчыкаў. Мы спадзяёмся, на падставе актыўнага настрою мас выбаршчыкаў, што поспех галасавання за кандыдатаў сталінскага блока комуністаў і беспартыйных будзе забяспечан яшчэ раз з новай сілай.

ВЫБАРЧЫЯ ЎЧАСТКІ Ў БАЛЬНІЦАХ

Некаторыя выборшчыкі нашага горада 24 сакавіка будуць знаходзіцца ў бальніцах.

Якім-жа чынам яны будуць прымаць удзел у выбарах?

На гэта пытанне адказны сакратар Беластоцкага гарадскога выканаўчага камітэта тав. Окунь паведаміў:

— У двух буйных бальніцах рашэннем горвыканкома створаны дзве ўчастковыя выбарчыя камісіі, у склад якіх увайшлі прадстаўнікі партыйных і грамадскіх арганізацый, работнікі бальніц, члены прафсаюза медсанпрацы.

Агітатары правялі з хворымі некалькі гутарак аб кандыдатах у дэпутаты Вярхоўных Советаў СССР і БССР, аб парадку галасавання ў бальніцах і т. д.

На ўчастках у бальніцах абсталяваны кабіны для тайнага галасавання і падрыхтованы урны. Да цяжка хворых члены камісій будуць прынасіць урны непасрэдна да ложкаў.

У дробных бальніцах, у якіх, згодна Палажэнню аб выбарах, не павінны ствараць асобныя выбарчыя ўчасткі, хворыя будуць абслужаны выбарчымі камісіямі тых участкаў, на якіх знаходзіцца тая ці іншая бальніца.

ПЕРШЫ ВОПЫТ

(Аб зборніку „На вызваленай зямлі")

Зборнік «На вызваленай зямлі», выпушчаны аргбюро пісьменнікаў гор. Беластока да выбараў у Вярхоўныя Советы СССР і БССР, з'яўляецца першай кнігай, якая аб'ядноўвае пісьменнікаў Масквы, Мінска і Беластока.

Перад рэдкалегіяй зборніка стаяла канкрэтная палітычная задача: актывізаваць пісьменніцкую грамадскасць Беластока і забяспечыць мастацкім літаратурным матэрыялам агітбрыгады і тэатральныя калектывы, якія працуюць на выбарчых участках. Вопыт удзелу рускіх і беларускіх пісьменнікаў у выбарах (выданне ў Маскве кнігі «За лучших людей», у Мінску — «Радзіме і правадыру») падказаў ідэю выпуску спецыяльнага зборніка ў Беластоку. Ідэя гэта сустрэла падтрыманне Беластоцкага гарадскога і абласнога камітэтаў КП(б)Б, што дало магчымасць неадкладна прыступіць да работы.

Папярэднія нарады з мясцовымі аўтарамі паказалі наяўнасць каштоўнага літаратурнага матэрыялу і падрыхтавалі глебу для далейшай творчай работы. Час, які аставаўся да выбараў, абавязваў выпусціць зборнік у самы кароткі тэрмін. У аснову работы лёг цвёрды графік, трымаючыся якога зборнік «На вызваленай зямлі» удалося выпусціць за 8 дзён, што — прымаючы пад увагу мясцовую паліграфічную базу — з'яўляецца рэкордным для Беластока. Так, напрыклад, доўга прыходзілася шукаць шрыфтоў, рабіць набор у двух друкарнях і інш.

Упершыню ў гісторыі заходніх абласцей Беларусі кніга выходзіць на чатырох мовах — беларускай, рускай, яўрэйскай і польскай. Гэтым самым ажыццяўляецца на справе брацкае еднанне літаратур усіх народнасцей, якія насяляюць заходнюю Беларусь.

Упершыню пісьменніцкая грамадскасць Беластока, скарыстаўшы вопыт Масквы і Мінска, удзельнічае ў стварэнні спецыяльнай кнігі да выбараў у Вярхоўныя Советы. Калектыўная работа над зборнікам, безумоўна, дасць свае вынікі і будзе спрыяць далейшай кансалідацыі мясцовых пісьменніцкіх сіл, сярод каторых ёсць нямала таленавітых людзей.

У зборніку прынялі ўдзел 17 аўтараў, змясціўшы ў ім 18 вершаў і адно апавяданне, з якіх 4 на рускай мове, 4 — на беларускай, 8 — на яўрэйскай і 3 — на польскай.

Кніга адкрываецца вершамі на беларускай і рускай мове, якія прысвечаны непасрэдна выбарам і ў якіх гаворыцца аб першым кандыдаце народа, аб любімым нашым правадыру таварышу Сталіне, з іменем якога на вуснах працоўныя будуць галасаваць у дзень выбараў:

«В этот светлый день,
хрустальный,
Улыбающийся день
Миллионы скажут: Сталин,
Опуская бюллетень.»

Затым ідуць вершы паэтаў Кнапгайса, Равіча і Сфарда на яўрэйскай і польскай мовах пад аднолькавай назвай «Сталін».

«Якое даць табе імя?—свабода.
Якое даць табе імя?—шчасце.»

Так гаворыць яўрэйскі паэт Кнапгайс, звяртаючыся са шчырымі словамі любасці да нашага правадыра. З ім пераклікаецца другі яўрэйскі паэт Сфард і польскі паэт Равіч. З пачуццём глыбокай удзячнасці яны славяць светлы геній чалавецтва, які даў народам Заходняй Беларусі свабоду, шчасце і радасць.

Непасрэдна за вершамі, прысвечанымі таварышу Сталіну, ідуць вершы, прысвечаныя наркому абароны, дэпутату беларускага народа ў Вярхоўныя Советы СССР і БССР і нашай доблеснай Чырвонай Арміі, якая па волі вялікага Сталіна і пад кіраўніцтвам таварыша Варашылава стала на абарону народаў Заходняй Беларусі, разграміла польскае панства і прынесла на авеяных славай баявых сцягах мір і новае, цудоўнае жыццё.

З гэтых вершаў асабліва вылучаецца верш яўрэйскага паэта Памеранца «Чырвоная Армія», у якім ён з глыбокім пачуццём гаворыць аб сустрэчы Чырвонай Арміі, аб тым, што яна «не заваёўвае чужых краін, а падымае прыніжаны народ і заваёўвае сэрцы прыгнечанага класа».

Гэтая-ж тэма ўдзячнасці Чырвонай Арміі — вызваліцельніцы народа, — праходзіць і праз вершы Бурштэйна «Яны прышлі», Бынецкага — «17 верасня» (на яўрэйскай мове) і Шырвіндта — «Поля» (на рускай мове).

У вершах яўрэйскіх паэтаў Жырмана «Косы» і рабочага-маляра і паэта Фукса «Вызваленая праца» гаворыцца ўжо аб новым свабодным жыцці, і гэтыя вершы з'яўляюцца лагічным пераходам да вершаў, у якіх ізноў закранаецца тэма сёнешняга дня, тэма выбараў на аснове Сталінскай Канстытуцыі.

На гэту тэму мы маем у зборніку верш рускага паэта Галіцкага «За сталинских людей», апавяданне беларускага пісьменніка Якімовіча «Панскі яблык», верш польскай паэтэсы Валенціны Найдус «Выбаршчыцы», верш чырвонаармейца, пачынаючага паэта Шыдлоўскага «Пісьмо» і верш польскай пісьменніцы Елены Сельм «Мая матка».

Заканчваецца зборнік радасным светлым вершам паэта Кнапгайса «Вось гэта жыццё» і «Песняй» беларускага паэта Панчанкі:

Сталін — бацька родны
Хлеба даў галодным,
Расчыніў нам насцеж
Вароты да шчасця.

Такім чынам, зборнік, не гледзячы на рознастайнасць матэрыялу і жанраў, складае адно цэлае. Чырвонай ніткай праз яго праходзіць адна ідэя, прасякнутая адзіным пачуццём, гэта — любоў народа да таварыша Сталіна, удзячнасць Чырвонай Арміі за вызваленне з-пад панскага прыгнёту, радасць новага жыцця і заклік да народа аддаць на выбарах свае галасы за таго, хто даў гэтае жыццё, за тых, хто змагаўся за яго і хто будзе яго будаваць, ажыццяўляючы пад кіраўніцтвам таварыша Сталіна вялікія і неўміручыя заветы Уладзіміра Ільіча Леніна.

Павел ГЕРМАН.
Пятро ГЛЕБКА.

У совецкім Выбаргу

Вось яна, апошняя перашкода! Упоперак вуліцы, яшчэ занесенай снегам, ад аднаго спаленага дома да другога накіданы цюкі картону, пакрытыя зверху вырванымі з пад'ездаў дзвярыма. Барыкада. Усё, што асталося ад « лініі Манергейма», — той самы «рубеж абароны», аб якім месяц назад пісаў генерал Манергейм, як аб «новай лініі абароны», абяцаючы на ёй разгром совецкіх войск. Наверсе, на гэтай кучы хламу — велізарны мядзведзь, карычневае чучала з прыўзнятай правай лапай і выбітым вокам.

Далей вуліца, пакрытая снегам, з правіслымі правадамі трамвая, з дамамі, увешанымі выкрунтасістымі літарамі гандлёвых рэклам і залатымі выбаргскімі крэндзелямі. Цішыня. Блакітнае неба, снежны пыл, які асыпаецца з карнізаў спеп... Выбарг.

Але калі падняцца на дах высокага дома, які стаіць недалёка, відовішча прыгожага горада адкрываецца погляду. З усіх бакоў ён акружан вадою, здаецца, што мора ў ім больш, чым сухазем'я. Прама на поўначы чыгуначны вузел з мноствам пуцей і вакзалам, за якім пакрытыя лесам цямнеюць узвышшы Кар'ялы, налева — упаяная ў лёд, умацаваная на нахільных фундаментах старадаўняя крэпасць, заснаваная ў канцы XIII века, падымае свае вежы, увянчаныя купаламі, падобнымі на званы каталіцкіх цэркваў. Направа — чырвоны куб ваданапорнага збудавання з круглымі вокнамі, і далей, вакол — прамавугольныя кварталы, прамыя вуліцы з высокімі дамамі, большасць якіх пабудавана яшчэ да рэволюцыі. У залаты туман Фінскага заліва хаваюцца бясконцыя астравы, якія зліваюцца ўдалі ў суцэльную паласу лесу на гарызонце.

Паўднёва - ўсходнія акраіны горада спалены. Там, па шасейнай магістралі суцэльным патокам рухаюцца машыны і танкі, падцягваюцца войскі, дымяць паходныя кухні.

Старыя гаспадары пакінулі горад і адышлі за старадаўнюю крэпасць.

Па вуліцы Кайнаксенкату, да плошчы Ляхтээнторы рухаецца група нашых камандзіраў. На плошчы павінна адбыцца сустрэча з прадстаўнікамі фінскага камандавання.

Чоткім ваенным крокам камандзіры набліжаюцца да трох фінскіх афіцэраў, якія ўжо чакаюць на сярэдзіне плошчы.

Узаемныя прывітанні ў цішыні пустыннага халоднага горада, пад лёгкі трэск кінаапарата.

— Капітан, прадстаўнік фінскага армейскага корпуса. Прыбыў для перагавораў аб далейшых дзеяннях пры перадачы горада — гаворыць па-руску высокі афіцэр у доўгай шэрай шынелі з чырвонымі пятліцамі і трыма залатымі зорачкамі на іх.

— Маёр, камендант горада Выбарга.

— Фінскае камандаванне просіць, — гаворыць афіцэр, — дазволіць нам затрымацца ў раёне вострава да 14 гадзін.

Пасля гэтага часу мы адыйдзем далей.

Парламенцёры дастаюць карты. Астрыё алоўкаў прачэрчваюць кужачкі і стрэлкі, якія абазначаюць размяшчэнне войск. На карце маёра чырвоную і сінюю дужку падзяляе вузенькая палоска нейтральнай зоны.

— **Я** маю паўнамоцтвы, — гаворыць маёр, — задаволіць вашу просьбу.

Карты складваюцца.

— Можа быць, у вас ёсць якія-небудзь пытанні да нас, — гаворыць маёр.

Афіцэр перадае яшчэ некалькі просьб, якія маёр абяцае вырашыць у бліжэйшы час.

Гутарка закончана. Дагаварыўшыся аб наступнай сустрэчы і далікатна адказыраўшы, фінскія афіцэры ўходзяць.

На гадзінніку роўна дзесяць. Вясёлыя гудкі аўтамабіляў чутны з-за дамоў.

На новых трохвосных «ЗІС», у акуратна падагнаных кажушках і цёплых шапках рухаюцца на плошчу часці матарызаванай пяхоты. За імі, грукочучы гусеніцамі, размалваючы снежны наст, працягнуўшы на захад ствалы гармат, ідуць калоны танкаў — пабеданосных удзельнікаў нядаўніх баёў.

А ў гэты час на камандным пункце сапёраў кіпіць работа. Перш за ўсё прадстаіць размініраваць горад. Нядаўна прадстаўнікі фінскага камандавання перадалі нам планы мінных палёў, папераджальна ўказаўшы на асабліва магутныя міны. Іх трэба абясшкодзіць перш за ўсё.

Аднак многія месцы былі замініраваны, відаць, без ведама фінскага камандавання, таму пільнасць неабходна. Атрады сапёраў разыходзяцца па гораду. Па іх слядах рухаюцца дарожныя часці, разграбаючы снег, рассякаючы лёдавую корку, аслабаняючы маставыя для руху.

Электрыкі накіроўваюцца к цэнтральнай станцыі, да паніжальнай падстанцыі, спецыяльныя брыгады ідуць правяраць і рамантаваць асвятляльную сетку. Камендант горада аддаў распараджэнне даць святло да 19 сакавіка, і электрыкам прадстаіць прорва работы.

Ужо абследуюцца насосныя ўстаноўкі і вадаправод, якім, дарэчы сказаць, тут абсталёван толькі цэнтр — акраіны маюць толькі калодзежы з ручнымі насосамі. Хутка будзе пушчана і вада.

На чыгуначных пуцях дымяць паравозы, атрады прыводзяць у парадак вуліцы і вывозяць усякі хлам. Чырвоныя машыны пажарнікаў заязджаюць у завулкі, і струмені вады б'юць па датляваючых пажарышчах.

Мірнае будаўніцтва ўступае ў свае правы. Хутка совецкі Выбарг скіне з сябе снег і гразь, аслабаніцца ад слядоў разбурэння, і новае жыццё закіпіць у ім, жыццё светлае і радаснае, якога дастойны гэты выдатны горад.

Кар. АГАПАЎ,
Кар. ТАЛЧЫНСКІ.

ВЫБАРГ. На Выбаргскім шасэ прыведзены ў парадак масты, устаноўлены дарожныя знакі. Амаль без усякіх затрыманняў, мінаючы бязлічныя аўтакалоны, машына ўязджае ў горад.

Выбарг стаў совецкім горадам. Усюды кіпіць напружаная работа. Праводзяць расчыстку дарог, пракладаюць тэлеграфныя і тэлефонныя лініі, прыводзяць у парадак гарадскую гаспадарку. Сёння закончаны работы па ўстанаўленню прамой тэлефоннай сувязі паміж Ленінградам і Выбаргам.

Да Выбаргскага вакзала падышоў першы совецкі поезд. Яго вёў машыніст-комсамолец тав. Багданаў. Поезд упрыгожан партрэтамі кіраўнікоў партыі і ўрада, святочнымі транспарантамі, лозунгамі перамогі. На Выбаргскім вакзале ўпершыню гучаць совецкія песні.

Байцы - чыгуначнікі стаханаўскімі тэмпамі энергічна працуюць над аднаўленнем вакзала.

У горад прыбылі прадстаўнікі выканаўчага камітэта Ленінградскага абласнога Совета дэпутатаў працоўных, медыцынскія работнікі, інжынеры, спецыялісты комунальнай гаспадаркі.

(«Известия»).

З А Р У Б Я Ж О М

ФРАНКЛІН АБ АДНОСІНАХ ЗША ДА ВАЙНЫ Ў ЕЎРОПЕ

НЬЮ-ЙОРК, 22-III. (ТАСС). Газета „Нью-Йорк пост“ змясціла артыкул вядомага амерыканскага журналіста. Франкліна, які сумняваецца ў тым, што амерыканцы сапраўды жадаюць міру ў Еўропе, не гледзячы на свае дабрачынныя выказванні ў карысць міру, Франклін заяўляе, што хор злосных пратэстаў у ЗША супроць заключэння савецка-фінляндскага мірнага дагавора кідае дзіўнае святло на сутнасць амерыканскага пацыфізма. Нават ізаляцыяністы накшталт сенатара Клорка (штат Ідако) прапануюць разрыў дыпламатычных адносін з Расіяй, што здзіўляюча падобна на дыпламатычнае ўмяшанне ў замежны канфлікт.

Замежныя дыпламаты ў Вашынгтоне, прадаўжае Франклін, не вераць, што ЗША шчыра жадаюць міру. Наадварот, яны ўпэўнены, што амерыканцы шчыра жадаюць „працяглай дарагакаштуючай вайны, вайны на эканамічнае знясіленне, у выніку якой ЗША маглі-б у свой час атрымаць вялікую карысць“.

Карэспандэнт заяўляе, што ў цяперашні час дзякуючы вайне многа мільёнаў людзей ва ўсім свеце маюць работу. У выпадку падпісання міру, увесь свет, у тым ліку і ЗША, падвергнецца небываламу крызісу і беспрацоўю, яшчэ большаму, чым у 1929 годзе. Калі вайна скончыцца тым, што еўрапейская моладзь не будзе знішчана, то зусім немагчыма пазбегнуць эканамічнага крызіса, акрамя як шляхам соцыяльнай рэвалюцыі.

Амерыканцы пачынаюць разумець, піша ў заключэнне Франклін, што мір у Еўропе створыць большае напружанне ў ЗША, чым вайна.

—о—

АНТЫВАЕННЫЯ НАСТРОІ Ў БЕЛЬГІІ

БРУСЕЛЬ, 22 сакавіка (ТАСС). Галандская газета „Ньюве ротэрдамшэ курант“ у нумары ад 19 сакавіка ўказвае, што нядаўна ў горадзе Гертогенбош судзілі салдата за распаўсюджванне антываенных лістовак. Абвінавачваемы заявіў, што ён дзейнічаў, зыходзячы з антымілітарыстычных пабуджэнняў. Суд прыгаварыў салдата да трох год турэмнага зняволення.

Газета „Суар“ паведамляе аб арыштах двух комуністаў у горадзе Бруге. Яны абвінавачваюцца ў распаўсюджванні антываенных лістовак.

ЗА ШТО ПРЫТ ВЫКЛЮЧАН З ЛЕЙБАРЫСЦКАЙ ПАРТЫІ

ЛОНДАН, 22 сакавіка. (ТАСС). Як зараз высветлілася, асноўнай прычынай, прывёўшай да выключэння Прыта з лейбарысцкай партыі, была абарона ім палітыкі Савецкага Саюза і выкрыццё англійскіх планаў расшырэння сучаснай імперыялістычнай вайны. Пазіцыя Прыта надзвычай абазліла супроць яго прадажных лідэраў лейбарысцкай партыі і высокапастаўленыя ўрадавыя кругі Англіі.

Сваю пазіцыю, адабраючую палітыку СССР і выкрываючую палітыку англа-французскага ваеннага блока, Прыт выклаў у двух брашурах — „Свет Масквы“ і „Ці павінна вайна расшырацца“. Першая брашура, у якой змяшчаецца аналіз прычын правалу англа-франка-савецкіх перагавораў, разышлася у 170 тысяч экземпляраў. Другая, якая змяшчае вельмі рэзкую крытыку англійскай палітыкі ў адносінах да СССР, выкрываючая паклёпніцкую антысавецкую кампанію англійскага друку і паказваючая, хто з'яўляецца віноўнікам вайны ў Фінляндыі, ужо распрадана ў колькасці звыш 100 тысяч экземпляраў. Абедзве брашуры карыстаюцца вялікай папулярнасцю сярод шырокіх колаў чытачоў. Попыт на гэтыя брашуры расце, не гледзячы, у прыватнасці, на сапраўдную змову маўчання, якім акружыў англійскі друк выхад у свет другой брашуры Прыта.

Агенцтва Гавас аб новым французскім урадзе

ПАРЫЖ, 22 сакавіка. (ТАСС). Агенцтва Гавас паведамляе, што кабінет міністраў Рэйно састаіць „з такой-жа колькасці міністраў, як і ваенны кабінет Клемансо, але адрозніваецца двума ноўшаствамі: створан ваенны камітэт, які складаецца з старшыні савета міністраў, яго намесніка, ваеннага міністра, міністра калоній, міністра фінансаў і міністра блакады. Камітэт будзе засядаць тры разы ў тыдзень пад старшынствам Рэйно. Па-другое, створан паміжведамсцвены эканамічны савет, у які ўваходзяць міністр фінансаў і міністры, функцыі якіх звязаны з эканомікай. Савет будзе збірацца не менш раза ў тыдзень пад старшынствам старшыні савета міністраў“.

ГАЗЕТА „ЛІЕТУВОС ЖЫНІОС“ АБ СТРАТАХ ФІНСКАЙ АРМІІ

КАУНАС, 22 сакавіка. (ТАСС) Газета „Ліетувос жыніос“ апублікавала 19 сакавіка артыкул адстаўнога генерала Печуліоніса аб стратах, якія панесла Фінляндыя ў час ваенных дзеянняў. Печуліоніс, між іншым, піша: „Фінска-савецкая вайна з'яўляецца ўрокам, у асаблівасці для малых краін з абмяжаванымі сродкамі абароны і запасамі. Натуральна паўстае пытанне: на што спадзяваліся фіны? Няўжо яны разлічвалі на ўмовы барацьбы ў зімовы час? Няўжо яны не разумелі, што прэстыж СССР — вялікай краіны — дазволіць яму паступіць інакш?

Не маючы пэўнага дагавора, Фінляндыя паверыла ў добрую волю некаторых краін. Неабходна сказаць, што дзеянні дэмакратый як скандынаўскіх, так і саюзных краін не вытрымалі экзамена“.

Далей аўтар артыкула прыводзіць лічбы страт фінскай арміі. „Калі, як указвае Манергейм, было забіта больш 50 тысяч фінскіх салдат, то раненых, зыходзячы з вопыту мінулых войнаў, павінна быць у Фінляндыі не менш 200 тысяч. Усяго ў фінскай арміі было пад ружжом 500 тысяч чалавек, значыць палова фінскай арміі аказалася выбыўшай з строю“.

НА ЗАХОДНІМ ФРОНЦЕ

БЕРЛІН, 22 сакавіка. (ТАСС). Вярхоўнае камандаванне германскай арміі перадае наступную зводку: „На заходнім фронце ніякіх асаблівых падзей. Не гледзячы на неспрыяючае надвор'е, наша авіяцыя рабіла разведчыя палёты аж да паўночнай часткі Паўночнага мора“.

ПАРЫЖ, 22 сакавіка. (ТАСС). У афіцыяльным паведамленні аб ваенных дзеяннях, апублікаваных у Парыжы ўчора вечарам, адзначаецца „мясцовая актыўнасць абодвух бакоў у раёне Саара“. У сёнешнім дзённым паведамленні сказана, што „ноч прайшла спакойна на ўсёй лініі фронта“.

НЬЮ-ЙОРК, 22 сакавіка. (ТАСС). Як паведамляе агенцтва Юнайтэд Прэс, 19 сакавіка пры налёце англійскай авіяцыі на ваенна-паветраную базу на востраве Зільт, ваенныя аб'екты, за выключэннем ваеннага шпіталя, не пацярпелі.

УЗНАГАРОДЖАННЕ ВАЙСКОВЫХ ЧАСЦЕЙ, ЗЛУЧЭННЯЎ, НАЧАЛЬСТВУЮЧАГА САСТАВУ І ЧЫРВОНААРМЕЙЦАЎ ЧЫРВОНАЙ АРМІІ

За доблесць і гераізм, праяўленыя асабовым саставам пры выкананні баявых заданняў Камандавання на фронце барацьбы з фінскай белагвардзейшчынай, Прэзідыум Вярхоўнага Савета Саюза ССР узнагародзіў ордэнамі Саюза 23 вайсковых часці Чырвонай Арміі, з іх: 3 вайсковых часці ўзнагароджаны ордэнам Леніна, 20 вайсковых часцей—ордэнам Чырвонага Сцяга.

Сярод узнагароджаных часцей прадстаўлены ўсе асноўныя роды войск.

За ўзорнае выкананне баявых заданняў Камандавання на фронце барацьбы з фінскай белагвардзейшчынай узнагароджан другой медаллю «Залатая звезда» Герой Савецкага Саюза камдзіў Дзенісаў Сяргей Пракоф'евіч.

Званне Героя Савецкага Саюза, з уручэннем ордэна Леніна і медалі «Залатая звезда», прысвоена 171 камандзіру, палітработніку і чырвонаармейцу.

Прэзідыум Вярхоўнага Савета СССР асобным Указам узнагародзіў ордэнамі і медалямі Саюза за ўзорнае выкананне баявых заданняў Камандавання на фронце барацьбы з фінскай белагвардзейшчынай і праяўленыя пры гэтым доблесць і мужнасць 9.329 чалавек начальствуючага і чырвонаармейскага саставу Чырвонай Арміі, членаў сямей начальствуючага саставу, работнікаў шпіталяў і грамадзянскіх устаноў.

—«о»—

У калгасе „КІМ“

Хутка бяжыць конь. На снежным фоне паказаліся будынкі вёскі Глушкі. Дзіравыя, саламяныя стрэхі, маленькія, напалову ўросшыя ў зямлю хаты. Гэта вёска, як і дзесяткі тысяч іншых вёсак у былой панскай Польшчы, была прыдаўленай, глухой, жабрацкай. Больш 70 гаспадарак тут мелі ў сваім карыстанні толькі 220 гектараў зямлі. Лясоў і лугавых угоддзяў зусім не было. Палова сялянскіх двароў мела толькі да 1—2 гектараў зямлі, а такія сяляне, як Турак, Салагубік ды іншыя, не мелі ні кавалачка сваёй зямлі.

Большасці сялян увесь час прыходзілася здабываць кавалак хлеба на старане, працуючы ад самага ранку да позняй ночы ў памешчыкаў, кулакоў і асаднікаў. І гэта ў той час, калі 12 гаспадарак асаднікаў, якія былі паселены навокал вёскі і трымалі яе ў цісках, карысталіся 233 гектарамі самай лепшай зямлі і ўсімі лугавымі ўгоддзямі.

Нянавісці да памешчыкаў, кулакоў і асаднікаў не было меры. Затаіўшы ў сэрцы крыўду, сяляне чакалі свайго вызвалення, свабоднага і радаснага жыцця. Заветная мара сялян вёскі Глушкі збылася. З прыходам Чырвонай Арміі яны ўздыхнулі поўнымі грудзьмі. Сяляне атрымалі 233 гектары зямлі, 29 кароў, 27 авечак, 13 свіней і 3 коняй.

1 сакавіка ў вёсцы Глушках арганізаваўся калгас „КІМ“. У калгас уступіла 64 гаспадаркі беднякоў і серадлякоў. З першых-жа дзён калгаснікі дружна ўзяліся за работу. Створаны дзве паляводчыя брыгады. Для догляду жывёлы вылучаны лепшыя калгаснікі. Загадчыкам калгаснай жывёлагадоўчай фермай калгаснікі вылучылі тав. Капота. Ён з усёй адданасцю ўзяўся за работу, па-гаспадарску арганізаваў догляд калгаснай жывёлы.

У калгасе разгорнута падрыхтоўка да веснавой сяўбы. Тут перш за ўсё ўзяліся за ссыпку і ачыстку насення, за рамонт сельскагаспадарчага інвентару, каб першую савецкую вясну сустрэць добра падрыхтаванымі.

Д. Еўдакімаў

Калгас імені Чырвонай Арміі

Аб радасным і заможным жыцці калгаснікаў краіны соцыялізма некаторыя сяляне вёскі Задваранцы, Свіслацкага раёна, чулі па радыё яшчэ да прыходу Чырвонай Арміі. Іх вельмі цікавіла калгаснае жыццё. І вось пасля прыходу Чырвонай Арміі ў вёсцы на кожным сходзе гаварылі аб калгасным жыцці.

У часе падрыхтоўкі да выбараў у Вярхоўныя Саветы СССР і БССР сяляне вывучылі Сталінскую Канстытуцыю і статут сельскагаспадарчай арцелі. Большасць сялян вёскі, пераканаўшыся ў перавазе калектыўнай гаспадаркі над аднаасобнай, рашылі стаць на калгасны шлях.

15 сакавіка ў вёсцы адбыўся сход. Прысутнічалі старыкі, старухі, моладзь. Доўга і падзелавому абмяркоўвалі яны важнейшае пытанне свайго жыцця. Яны аднадушна рашылі арганізаваць калгас, у які запісалася 30 гаспадарак. Калгаснікі прысвоілі назву свайму калгасу — імя Чырвонай Арміі.

В. Дудкін.

ПА БЕЛАСТОКУ І ОБЛАСЦІ

—о—

У АБЛВЫКАНКОМЕ

Усім старшыням гарадскіх і раённых выканаўчых камітэтаў даны падрабязныя ўказанні аб арганізацыі ўсямернай дапамогі акруговым і ўчастковым выбарчым камісіям па правядзенню выбараў і па падвядзенню вынікаў галасавання.

Канчатковыя вынікі выбараў (лічбовыя даныя, пратаколы галасавання і т. д.) не пазней 26 сакавіка непасрэдна акруговымі камісіямі будуць перадавацца ў Беласток—аблвыканкому, у Мінск — Прэзідыуму Вярхоўнага Савета БССР і ў Маскву — Прэзідыуму Вярхоўнага Савета СССР. Матэрыялы аб выніках выбараў з Беластока пасылаюцца ў Маскву і Мінск на самалётах.

Для дапамогі мясцовым арганізацыям у рабоце па завяршэнню выбарчай кампаніі аблвыканком накіраваў рад адказных работнікаў. У памяшканні аблвыканкома 24, 25 і 26 сакавіка ўстанаўліваюцца кругласутачныя дзяжурствы адказных работнікаў, у веданні якіх будзе знаходзіцца звяно самалётаў.

АБЛАСНАЯ МАСТАЦКАЯ ВЫСТАЎКА

23 сакавіка ў Беластоку ў абласным Доме партыйнай асветы адкрываецца абласная мастацкая выстаўка, арганізаваная абласным аддзелам мастацтва сумесна з арггрупай саюза мастакоў.

У выстаўцы ўдзельнічае 51 мастак, сярод іх графікі Кшэчаноўскі, Краеўскі, Тыбар, Ляндау, жывапісцы Розенман, Борэнштайн, Краеўскі, скульптар Месер і іншыя.

Агульная колькасць выстаўленых твораў — 222. З іх добрым выкананнем адзначаюцца малюнак Кшэчаноўскага, які паказвае сялянку з ружжом на стражы нацыяналізаванага маёнтка, эскіз карціны Маляровіч на тэму «Допыт памешчыка ў сялянскім камітэце», эскіз карціны Разанецкага «Таварыш Прыцкі у турме», карціна Габера «Пасяджэнне фабкома» і скульптуры Месэра: бюст таварыша Сталіна і Вольная сялянка».

На выстаўцы ёсць таксама куток народнай творчасці, дзе выстаўлены розныя тканіны, малюнкі і акварэлі.

МЕХАНІЗАЦЫЯ БЕЛАСТОЦКАЙ МЕБЕЛЬНАЙ ФАБРЫКІ

Пачалася механізацыя беластоцкай мебельнай фабрыкі. Зараз устанаўліваецца на ёй вялікі стругальны станок. Увядзенне гэтага станка значна знізіць сабекошт прадукцыі.

На працягу 1940 года фабрыка выпусціць 2 тысячы канцылярскіх шаф, 2.000 вялікіх пісьмовых сталоў, 1.000 шаф для вопраткі, 1.000 звычайных сталоў і т д.—на агульную суму ў 1.446 тысяч рублёў па цэнах 1926 — 27 г.г.

ПАДСОБНАЯ ГАСПАДАРКА ПЕРШАГА ТЭКСТЫЛЬНАГА КАМБІНАТА

100 гектараў зямлі, 10 жылых памяшканняў і розныя гаспадарчыя будынкі атрымаў 1-шы беластоцкі тэкстыльны камбінат для арганізацыі прыгараднай падсобнай гаспадаркі.

У жылых памяшканнях гэтай гаспадаркі будуць абсталяваны дамы адпачынку для рабочых камбіната.

У гаспадарцы зараз ёсць 30 карэў, 50 свіней. Камбінат праводзіць закупку коней. 40 гектараў зямлі будуць выкарыстаны пад сяўбу зерневых, 5 — 8 гектараў — пад агародніну, а астатняя зямля — пад пасбішча.

Адказны рэдактар
Б. М. ЗЕЛЬМАНАЎ.

Адрас рэдакцыі і выдавецтва: г. Беласток, будынак Аблвыканкома, Тэлефоны рэдакцыі: адказнага рэдактара — 22 (па камутатару аблвыканкома) і 49 (гарадзкі), сакратарыята, партыйнага і савецкага аддзелаў — 23 (па камутатару аблвыканкома), прамысловага, сельскагаспадарчага, культуральнага і інфармацыйнага аддзелаў — 17-62 (гарадзкі). Тэлефон выдавецтва і аддзела аб'яў — 16-10, Тэлефон друкарні і начной рэдакцыі — 5-21.
Падпіску на газеты прымае «Саюздрук» (Тэлефон 5-14).

Упаўнаважаны абліта № 416.

1-я дзяржаўная друкарня ў г. Беластоку